КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ

# Дэкларацыя аб знешнепалітычных прыярытэтах дэмакратычнай Беларусі

[ Канферэнцыя Новая Беларусь 03-04 Жніўня 2024 ]

***Мы, дэмакратычныя сілы Беларусі, разумеючы важнасць выбудоўвання інстытуцыйных адносін з міжнароднымі партнерамі, дэкларуем наступныя прыярытэты ў знешней палітыцы:***

Мы накірваныя ў сваёй працы на дыялог, пашырэнне і ўзмацненне супрацы з нашымі ключавымі партнёрамі, а менавіта Еўрапейскім саюзам, Вялікабрытаніяй, ЗША і Украінай, з мэтай захавання суверэнітэту і незалежнасці дэмакратычнай Беларусі, аднаўлення яе бяз'ядзернага статуса, узнаўлення дабрасуседскіх адносін у рамках новай сістэмы рэгіянальнай бяспекі.

Пацвярджаючы прыхільнасць еўрапейскага выбару для Беларусі, мы вітаем развіцце супрацоўніцтва з ЕС у межах створанай Кансультатыўнай групы Беларусь-ЕС і Кантактнай групы па Беларусі Рады Еўропы, стратэгічна важных крокаў да еўрапейскай будучыні для Беларусі.

Змагаючыся за дэмакратычную будучыню Беларусі, мы ўдзячны ЗША за пачатак стратэгічнага дыялогу з дэмакратычнымі сіламі Беларусі і ўпэўнены, што інстытуцыйная супраца з ЗША ўзмацняе патэнцыял для дэмакратычных зменаў.

Лічачы галоўнай каштоўнасцю незалежнасць Беларусі, мы выказваем салідарнасць Украіне і яе народу, які змагаецца не толькі за сваю ўласную свабоду і незалежнасць, але і за будучыню краін нашага рэгіену і міжнародную бяспеку. Мы падтрымліваем і працягнем падтрымліваць Украіну ў яе барацьбе тымі сродкамі і рэсурсамі, якія знаходзяцца ў нашым дасягу.

Мы заахвочваем нашых ключавых партнераў да пашырэння інфармацыйных, культурных, адукацыйных, і іншых праектаў і праграмаў, якія накіраваныя на беларускае грамадства, ствараючы дадатковыя магчымасці беларусам у развіцці сувязяў з дэмакратычнымі краінамі, а таксама ўзмацняючы сувязі паміж беларускай дыяспарай і беларусамі ўнутры краіны.

Мы звяртаемся да нашых партнераў з заклікамі аб тым, каб абмежавальныя меры ў дачыненні да рэжыму Лукашэнкі не неслі дыскрымінацыйнага характару ў дачыненні да беларусаў і не абмяжоўвалі права беларусаў на перамяшчэнне, а таксама аб падтрымцы легалізацыі беларусаў, якія былі вымушаны пакінуць Беларусь.

Мы разлічваем на далейшую стратэгічную падтрымку нашых міжнародных партнераў у барацьбе беларускага грамадства за незалежнасць, свабоду і дэмакратыю.

*Прынята на Канферэнцыі Новай Беларусі*
*г. Вільнюс, 3-4 Жніўня 2024*